**І. І. Крук,** *загадчык кафедры этналогіі
і фальклору БДУ культуры і мастацтваў*

# АЎТЭНТЫЧНЫ ФАЛЬКЛОР БЕЛАРУСАЎ ЯК ГІПЕРТЭКСТ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДУХОЎНАСЦІ

Праблемнае поле фальклорнай традыцыі ахоплівае як дыяхронныя, так і сінхронныя аспекты існавання. Наўрад ці можна з абсалютнай дакладнасцю акрэсліць той гістарычны перыяд, які б можна было назваць "залатым векам" нематэрыяльнай культурнай спадчыны, таму што, нягледзячы на яе глыбока кансерватыўны характар, яна існавала ў пэўнай дынаміцы не толькі на ўзроўні паэтычнага сімвалізму, але і сістэмы жанраў. Аднак сёння мы ставім перад сабой задачу акрэсліць асноўныя этапы эвалюцыі, ролі фальклору ў жыцці грамадства і рэканструкцыі сінхроннага зрэзу традыцыі, якой яна зафіксавана ў другой палове XIX – пачатку XX ст. і паралельна з гэтым адказаць на пытанне аб ролі фальклору ў жыцці трох асноўных мікрасоцыумаў – суб'ектаў захавання, актуалізацыі і трансляцыі традыцыі: сям'і – роду – вясковай абшчыны. У нашым выпадку мы пакідаем па-за ўвагай больш буйныя соцыумы, а таксама прамысловыя і рамесніцкія аб'яднанні, якія таксама мелі сваю фальклорную традыцыю. Адказ на гэта фундаментальнае пытанне дапаможа адрэфлексіраваць сучасны фальклорны дыскурс і паспрабаваць акрэсліць некаторыя прагнастычныя крокі інкультурацыі сучаснага соцыуму ў духоўнае поле фальклорнай архаікі або аўтэнтыкі.

Фенаменалагічным рашэннем пастаўленай задачы займаліся самыя знакамітыя этнографы і фалькларысты рускай, усходнеславянскай, славянскай, еўрапейскай і амерыканскай навуковых школ. Назавём прозвішчы толькі некаторых з іх: Д.Как'яра, С.А.Токараў, А.М.Пыпін, М.К.Байбурын, С.Аверынцаў, Б.Маліноўскі, П.Г.Багатыроў, К.Машыньскі, Л.Нідэрле, М.Эліадэ і інш.

Метадалагічная праблема акрэслівання меж фальклорнай традыцыі мае даўнюю гісторыю, аднак дэфініцыі, якая была б здавальняючай для прадстаўнікоў розных навуковых школ, не існуе да нашага часу. Разам з тым пры ўсёй варыятыўнасці нюансаў, відаць, прынцыповы падзел ляжыць у плоскасці апазіцыі вербальны / невербальны. Пераважная большасць фалькларыстаў і этнографаў савецкага часу фальклорам называлі "сукупнасць слоўных тэкстаў, якія ўвайшлі ў вусную бытавую традыцыю таго або іншага этнасу"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(Чистов К.В. Народные традиции и фольклор. – Л.: Наука, 1986. – С. 30). У межах гэтай традыцыі падаецца вызначэнне “народнай паэтычнай творчасці” ў другім томе энцыклапедычнага выдання “Беларускі фальклор”: “.. від мастацкай творчасці народа, што адлюстроўвае рэчаіснасць у вобразах, створаных паэтычным словам”. (Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. Т.2. – Мн.: БелЭн, 2006. – С. 224). Зразумела, што па-за межамі гэтай дэфініцыі застаюцца народныя веды, вераванні, назіранні за станам надвор’я, народная астраномія, медыцына, харэаграфія, дэкаратыўна-побытавае мастацтва, тыя найважнейшыя складовыя, якія ў некаторых краінах Захаду ўключаюцца ў склад фальклору.

Наўрад ці дапамогуць канчатковаму вырашэнню гэтай праблемы ініцыятывы ЮНЕСКА, пад эгідай якой у апошнія гады былі прыняты канвенцыі аб захаванні матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва. Парадыгмальныя межы паняцця “нематэрыяльная культурная спадчына” значна шырэй аб’ёму паняцця “фальклор”, таму што ўключаюць той метатэкст культуры, які створаны з удзелам цела чалавека (уключаючы танец, песню) без дапамогі якіх-небудзь прыстасаванняў або іншых рэчаў.

Кароткі экскурс у гісторыю станаўлення фальклору дазваляе вылучыць некалькі стадый яго развіцця і, што для нас мае самае галоўнае значэнне, акрэсліць ролю і месца ў жыццядзейнасці грамадства як гіпертэксту паэтычнай творчасці і адпаведна духоўнасці тых, хто яе здзяйсняў.

Для архаічнага тыпу грамадства характэрна непадзельнае, сінкрэтычнае становішча духоўнай культуры. Фальклорнае мастацтва было самым непасрэдным чынам знітавана з рознахарактэрнымі комплексамі, якія ў працэсе далейшага развіцця спрычыніліся да розных адгалінаванняў духоўнай культуры, абрадаў, павер’яў, рэлігіі, міфаў, песень, казак, наратыўных жанраў і інш. З гэтага вынікае, што фальклорам можна лічыць усе формы духоўнай культуры, звязаныя з мовай і мастацкім словам, або, інакш кажучы, “усе традыцыйныя слоўныя тэксты, якія ўтвараюць другасныя моўныя мадэліруючыя сістэмы” (маецца на ўвазе ў параўнанні з самой мовай; Чистов К.В., с. 32). Адпаведна ўжо на гэтай стадыі развіцця фальклору існуюць даволі складаныя па сваёй структуры сістэмы фальклорных тэкстаў, якія задавальняюць самыя розныя запатрабаванні грамадства – камунікатыўныя, пазнавальныя, сацыяльна-статусныя, рэлігійныя, геданічныя, гульнявыя, магічныя, семіятычныя і інш. Гэта значыць, што фальклор, як адзначаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У.Я.Проп, выконваў інтэгруючую ролю не толькі ў абрадавай сферы, але і ва ўсёй сферы духоўнай культуры. (Пропп, В.Я. Специфика фольклора // Труды юбилейной научной сессии Ленинград. гос. ун-та им. А.А. Жданова. Секция филол. наук. – Л., 1946. – С. 138–151). Фальклор перш-наперш выконваў ролю “стабілізатара розных формаў дзейнасці пры дапамозе слоўных тэкстаў” (Чистов К.В., с. 33).

Шматвекавое развіццё культуры прыводзіць да таго, што пануючае архаічнае становішча фальклору змяняецца стадыяй культурнага дуалізму, або, паводле тэрміналогіі Ю.Крысцевай, “постсінкрэтычным становішчам”, падчас якога гамагенная монафальклорнасць саступае месца паралельнаму суіснаванню розных культурных традыцый. Суіснаванне гэта не заўсёды мае камплімэнтарна-вітальны характар. Нараўне з традыцыйнымі народнымі ведамі развіваецца навука, фальклорныя жанры становяцца апірышчам для ўзнікнення разнажанравых літаратурных твораў, побач з традыцыйнымі вераваннямі і абрадамі выступаюць царква і тэалогія, побач са жрацамі – свяшчэннікі. Паралельна з хатнімі рамёствамі фарміруюцца арганізацыі рамеснікаў, вытворчы прадукт якіх зарыентаваны на продаж. Побач з дэкаратыўна-побытавым мастацтвам актыўна развіваецца прафесійнае, побач з народнай медыцынай – медыцынская навука і г.д.

Вельмі важна пры гэтым адзначыць, што вытворчасць (аднаўленне, выкананне і актуалізацыя) і спажыванне (успрыманне, функцыянаванне) дыстанцыруюцца, дзеляцца на дзве самастойныя сферы. На гэтай стадыі фальклор перастае быць культурным манапалістам, які ўсебакова вызначаў культурніцкую традыцыю этнасу. Аднак як раз у гэты час завяршаецца фарміраванне той сістэмы жанраў, якую і пачалі фіксіраваць найбольш раннія збіральнікі беларускага фальклору. І ўсё ж мы павінны адзначыць, што спектр функцый вуснапаэтычнай творчасці пачынае звужацца разам са звужэннем сферы бытавання ў структуры этнасу. Найбольш выразна аб гэтым сведчыць само вызначэнне традыцыйнай культуры як народнай. Тое, што тры тысячагоддзі таму было характэрна для старажытнарымскай імперыі – падзел духоўнай культуры на традыцыю поліса (горада) і вёскі, – з зусім недарэчнай для беларускамоўнай стыхіі вызначэннем, падхопленым маладой генерацыяй нашых гісторыкаў, паганскай, з надзвычайнай дакладнасцю паўтарылася ў гісторыі беларускай духоўнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэці этап суіснавання фальклорнай традыцыі і этнасу звязаны з перыядам фарміравання сучасных нацый і развіццём нацыянальнай самасвядомасці. Для гэтага часу характэрны фундаментальныя цывілізацыйныя працэсы, якія мелі надзвычай дынамічны і ўсёахопны характар. Сярод іх – ліквідацыя непісьменнасці і развіццё сістэмы адукацыі. Адным з краевугольных камянёў існавання фальклорнага тэксту – спецыяльны трэнінг памяці пераймальнікаў традыцыі, адшліфаванай да такой ступені, калі вялікія паэтычныя тэксты, напрыклад валачобных песень, балад, былін, казак, замоў, патрэбна было завучыць у абсалютнай дакладнасці як уласна вербальнага тэксту, так і экстралінгвістычных фактараў яго актуалізацыі. Другім важным фактарам становіцца развіццё сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі. На гэтай стадыі развіцця (якую можна ўмоўна назваць стадыяй урбанізацыі) сацыяльны арэал функцыянiравання фальклорных формаў працягвае звужацца. Калі ж улічыць гвалтоўныя кампаніі перыяду станаўлення савецкай дзяржавы супраць царквы і рэлігіі, супраць свят традыцыйнага і хрысціянскага календара і адначасовае прымусовае ўвядзенне секулярызаванага, але ідэалагічна падмацаванага грамадзянскага календара, аздобленага творамі мастацкай самадзейнасці, то трэба без перабольшання сказаць, што даволі працяглы час сфера фальклорнай запатрабаванасці была звужана да таго мінімуму, які не дае спадзяванняў на рэгенерацыю фондаў пасіўнай памяці і аднаўленне традыцыі ва ўсёй мнагамернасці яе актуалізацыі.

Надзвычай цікавым, фенаменальным трэба прызнаць перыяд існавання фальклорнай традыцыі ў апошняй чвэрці XX ст. Абвальныя масавыя міграцыі канца 60–70-х гг., інтэнсіўны рост гарадоў, якія практычна цалкам увабралі ў сябе не адно пакаленне моладзі, прымусовыя постчарнобыльскія перасяленні прывялі да таго, што тысячы людзей аказаліся адарванымі ад каранёвай традыцыі, ад той сацыякультурнай сферы, якая фарміравала самасвядомасць, асаблівасці светасузірання, карціну свету ў цэлым, і адначасова не змаглі дарасці, зразумець і прыняць элітарную культуру горада, апынуліся ў фарс-мажорных (ці дакладней – мінорных) умовах карабельнага баласту. І вось тое, што адбылося напрыканцы мінулага тысячагоддзя, яшчэ доўга будуць аналізаваць сацыёлагі і культуролагі, але, на нашу думку, недаацанілі (або своечасова не адрэагавалі на гэту тэндэнцыю) фальклarysты. У краіне пачаўся шырокамаштабны фальклорны рэнесанс. Прычым яго хваля мела двухвектарную накіраванасць. З аднаго боку, да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паўнавартасных маштабаў актуалізацыі традыцыі вярнулася беларуская вёска, а з другога – дынамічна спрацавала самасвядомасць, або мацярынская генетычная памяць пакалення тых дзяцей, бацькі якіх некалі памянялі сваё месцажыхарства і падаліся ў горад. Зразумела, што гэты феномен менш за ўсё цікавіў прафесіяналаў-фалькларыстаў, але, на жаль, не адрэфлексіраваны нашымі філосафамі і этнакультуролагамі. Нам падаецца, што якраз гэты падарунак гісторыі мог шмат што прыадкрыць для нас у сапраўдным разуменні ролі і месца фальклорнай спадчыны ў полі духоўных прыярытэтаў сучаснага поліэтнічнага і полікультурнага грамадства.

А зараз некалькі слоў аб фундаментальных праблемах і прыкладных навуковых даследаваннях нашай найбагацейшай духоўнай спадчыны.

За два стагоддзі актыўнай збіральніцкай дзейнасці і правядзення навуковых даследаванняў беларускія фалькларысты і этнографы, а таксама навукоўцы памежных краін, якія праяўлялі інтарэс да беларускай этнакультурнай традыцыі, прайшлі пакручасты і складаны шлях ад рамантызму, каля вытокаў якога стаялі браты Грым, праз пачварныя выкрутасы вульгарнага сацыялагізму да гісторыка-параўнальных даследаванняў. Безумоўна, найважнейшы росквіт беларускай фалькларыстыкі прыпаў на той час, калі быў створаны Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі. Вяршыняй яго навуковай стратэгіі быў перыяд 70 – пачатку 90-х гг. XX ст., калі былі выдадзены 52 тамы серыі “Беларуская народная творчасць”, калі ім быў праведзены шырокамаштабны праект па вывучэнні генезісу, паэтыкі, сістэмы вобразаў, жанравай сістэмы беларускага фальклору. Своеасаблівым падвядзеннем вынікаў таго часу стала шасцітомнае калектыўнае выданне, якое ўбачыла свет зусім нядаўна.

Паралельна з гэтым магістральным кірункам даволі моцна і выразна заявіла аб сабе тэндэнцыя даследавання рэгіянальных этнакультурных традыцый, сфакусіраваная перш за ўсё вакол універсітэцкіх даследчыцкіх цэнтраў. А што далей?

Якія ініцыятывы неабходна распачаць, каб гіпертэкст фальклорнай традыцыі яшчэ пры жыцці нашага пакалення не стаў музейным экспанатам, які абнясуць чырвонай стужкай і прычэпяць шыльду “Не чапаць”? На наш погляд, шырокі спектр ініцыятыў павінен быць сфакусіраваны вакол чатырох прыярытэтных напрамкаў. Заўважым пры гэтым, што нічога прынцыпова новага тут

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не адкрыеш, па-рознаму могуць быць расстаўлены толькі акцэнты гэтай дзейнасці.

Па-ранейшаму галоўнымі задачамі застаюцца франтальнае абследаванне пэўных рэгіёнаў і максімальная фіксацыя твораў фальклорнага мастацтва на самыя сучасныя сродкі захавання інфармацыі. Перад намі стаіць задача стварэння атласа нематэрыяльных культурных каштоўнасцей з указаннем самага шырокага спектра складовых рытуальна-абрадавых комплексаў і вызначэння дакладных арэалаў іх бытавання.

Другая задача – ахова помнікаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Гэта павінна быць адным з прыярытэтаў у дзейнасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Пад гэтым мы маем на ўвазе грунтоўную заканадаўчую базу, якая ўзвядзе фальклор у статус надзвычайнай нацыянальнай каштоўнасці, жыццядзейнасць якой неабходна падмацоўваць сістэмамі фестываляў, круглых сталоў, навукова-практычных канферэнцый. Мяркуем, што настаў той час, калі трэба стварыць спецыялізаваны навукова-метадычны часопіс “Народазнаўства”, а таксама ўвесці на Беларускім тэлебачанні праграму, якая б займалася праблемамі аховы і папулярызацыі фальклору, яго таленавітых носьбітаў. Фрагментарна гэта праблема ўздымаецца на каналах БТ, аднак ад іх перадач вее надзвычайным непрафесіяналізмам.

Трэцяя задача – фундаментальныя і прыкладныя даследаванні ў галіне традыцыйнага фальклору. Мы глыбока перакананы ў тым, што рэсурс жанрава-відавога вывучэння фальклору вычарпаны, тут наўрад ці можна чакаць прынцыпова важных адкрыццяў. Настаў час інтэграванага, міждысцыплінарнага, комплекснага асэнсавання фальклору. За апошнія 50 гадоў мы дасціпна даследавалі асобныя жанры каляндарна-абрадавай паэзіі, але да гэтага часу так і не ведаем, якім быў традыцыйны каляндар беларусаў нават тры стагоддзі таму, не кажучы ўжо пра тое, якім ён быў да распаўсюджання хрысціянства. Зусім не даследаваным жанрам застаюцца замовы, казкі, не вывучаны гарадскі фальклор, фальклор рамесніцкіх аб’яднанняў.

Аднак самае галоўнае – трэба ўзняцца над бытавой рэальнасцю, якую ўвесь час навязвалі фальклору, і паказаць яго касмізм, энергаінфармацыйны патэнцыял, раскрыць структуру архетыпаў і сакральна-магічную функцыю скразных даследаванняў народнай культуры, напрыклад, раскрыць рух Сонца па знаках задыяка і паказаць, што іх арнаментыка ляжала ў аснове арнаментальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карункаў карагодаў; прааналізаваць экспрэсію танца і разьбы па дрэве – ліштвы, а таксама ручнікоў і народных строяў. Сучасныя камп'ютэрныя праграмы даюць магчымасць вывучаць алгарытмічныя матрыцы беларускага арнаменту і меладычных асноў архаічнай абрадавай песнятворчасці.

Аднак ўсё гэта вымагае зусім іншага падыходу да каардынацыі нашай дзейнасці. Сёння яе наогул не існуе ні ў падрыхтоўцы навуковых кадраў, ні ў правядзенні сумесных даследаванняў або фальклорных экспедыцый. А нам неабходны навуковы саюз з прадстаўнікамі не толькі гуманітарных, але і дакладных навук.

Нарэшце, яшчэ адной актуальнай праблемай з'яўляецца міжпакаленная пераемнасць фальклорнай спадчыны. Канечне, аўтэнтыка вымагае таго, каб традыцыя перадавалася з той дакладнасцю, якая пазначана ў чарадзейных казках: "Голас у голас, волас у волас". Аднак такіх магчымасцей становіцца ўсе менш і менш, таму на дапамогу павінна прыйсці і ўжо прыходзіць сфера адукацыі. Ствараюцца фальклорныя гурты, адкрываюцца адпаведныя спецыялізацыі ў розных універсітэтах, у тым ліку і ў нашым. Але ж мы разумеем, што гэта ўжо далёка не тое, што называлася жывой фальклорнай стыхіяй.

І тым не менш мы павінны актыўна працаваць на ніве таго, каб не стаць сведкамі канчатковага згасання шматвекавой традыцыі. Вопыт, жаданне і ініцыятыва дапамогуць зрабіць важкі ўклад у справу захавання, вывучэння і пераймання таго пласта этнічнай духоўнасці, які некалі паўплываў на наш менталітэт, светаўспрыманне, глыбокую павагу да продкаў, любоў да сваёй Радзімы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ